This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2022.pp.155-190

Przegląd Środkowo-Wschodni, 7, 2022
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20220708

Data przesłania: 02.07.2022
Data akceptacji: 24.07.2022

**Андрэй Любы**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
liuby@bsu.by
ORCID: 0000-0001-5612-5847

# Падручнікі па гісторыі Беларусі як люстэрка фарміравання і эвалюцыі нацыянальнага гістарычнага наратыву ў 1990-я – 2010-я гады[1]

W artykule przeanalizowano treść podręczników do historii Białorusi pod kątem kształtowania narodowej narracji historycznej w latach 1991–2020. Autor przedstawia różnice w postrzeganiu przeszłości, które występują w podręcznikach używanych w szkolnictwie średnim i szkolnictwie wyższym. Przybliża najważniejsze zagadnienia historyczne, które były interpretowane w odmienny sposób pod wpływem zmieniającej się polityki historycznej Białorusi. Autor analizuje również uwarunkowania kształtowania narodowej narracji historycznej. Ponadto autor ukazuje wkład poszczególnych naukowców w tworzenie narodowej narracji historycznej w XXI w. W szczególności dotyczy to Michaiła Bicza, Pawła Łojkę, Jury'ego Bochana, Michasia Czarniauskiego.

Słowa kluczowe: historiografia, historia Białorusi, narodowa narracja historyczna, podręczniki

[1] Артыкул напісаны на аснове рэферату выступлення на канферэнцыі "Tożsamość białoruska: doświadczenia przeszłości i wyzwania teraźniejszości. Z okazji 30. rocznicy uzyskania przez Białoruś niepodległości", арганізаванай Кафедрай міжкультурных даследаванняў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Варшаўскага ўніверсітэта 1 красавіка 2021 г.

Часткай гістарычнай палітыкі ў навейшы час з'яўляецца наладжванне адносін паміж гістарычнай навукай і палітыкай дзяржавы. Вынікам такога супрацоўніцтва становіцца нацыянальны гістарычны наратыў (*далей* – НГН), які заключае ў сабе дасягненні нацыянальнай і рэгіянальнай гістарыяграфіі. Для Беларусі ў XX ст. стварэнне НГН адбывалася не менш як тры разы: у першай палове XX, 1950–1980-я гг., на прыканцы XX – пачатку XXI ст. Кожная часавая перазагрузка фарміравала сваю перыядызацыю, падыходы да беларускай дзяржаўнасці і яе форм, характарызавала эканамічныя трансфармацыі, пераацэнівала сацыяльныя, культурныя і этнічныя працэсы.

Праблема станаўлення нацыянальнага наратыву і яго функцыяніраванне ў XX ст. неаднаразова станавілася прадметам даследавання беларускай гістарыяграфіі і гісторыі педагогікі (Віктар Белазаровіч[2], Генадзь Сагановіч[3], Уладзімір Сідарцоў[4], Сяргей

---

[2] В.А. Белазаровіч, *Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: дапаможнік*. Гродна: ГрДУ, 2006 (Выд. 2-е, 2009); В.А. Белазаровіч, *Этапы і перыяды ў развіцці айчыннай гістарыяграфіі (20-я гады XX – пачатак XXI ст.)* [w:] *Проблемы методологии исследований истории Беларуси: Материалы международной научной конференции, Минск, 26–27 октября 2006 года / [редколлегия: А.А. Коваленя (ответственный редактор) и др.]*. Минск, 2008. С. 225–228; В.А. Белазаровіч, *Формирование и развитие концепции истории Беларуси в отечественной историографии (вторая половина XIX – начало XXI века)*. Гродно: ГрГУ, 2020.

[3] Г.М. Сагановіч, *Канструяванне афіцыйнага выкладу гісторыі ў пасляваеннай БССР* [w:] *Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў / Варшаўскі Універсітэт, Студыюм Еўропы Усходняй*. 2015, Г. 1, № 1. С. 201–218; H. Sahanowicz, *Białoruska historiografia wczoraj i dziś*. [w:] *Przegląd Wschodni*, – Warszawa, 2003, S. 759–775; H. Sahanowicz, *Nationaler Aufbruch und politische Reaktion: zehn Jahre Historiographie in Belarus'* [w:] *Österreichische Osthefte*, Wien, 2002, Jg. 44, H. 1/2. P. 137–149.

[4] В.Н. Сидорцов, *Проблема оптимизации социально-гуманитарного (исторического) образования в „негуманитарных" вузах Беларуси* [w:] *Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*. 2013, № 1, С. 35–38; В.Н. Сидорцов, *История как политика* [w:] *Беларуская думка*. 2014. № 4. С. 61–64; В.Н. Сидорцов, *Магистральное направление в развитии белорусской историографии* [w:] *Образы прошлого в историографии: белорусско-французский диалог : материалы к международной научно-практической конференции „Историография как объект исследова-*

Паноў[5], Аксана Колтан[6] і інш.). Неаднаразова праблему беларускіх школьных і ўніверсітэцкіх падручнікаў уздымалі ў перыядычным друку і ў сродках масавай інфармацыі (Таццяна Астроўская, Аляксей Братачкін, Ірына Раманава). Агляд школьных падручнікаў 2016–2018 гг. быў зроблены Аляксеем Ластоўскім зыходзячы з параўнаўчай парадыгмы выкладання гісторыі да і пасля пераходу на новы прынцып выкладання гісторыі ў беларускай школе[7].

Дзяржаўную палітыку на беларускіх землях у адносінах да гістарычнай навукі разглядаў у 1990-ыя гг. нямецкі даследчык Райнэр Лінднэр (Rainer Lindner)[8]. Свой погляд на ўплывы савецкай палітыкі на фарміраванне ведаў пра гісторыю Беларусі і фарміраванне гістарычных міфаў выказаў у манаграфіі "Гісторыя і міфы"

---

*ния", Минск–Париж, БГУ-МГЭИ, 21–22 мая 2008 г.* Минск, 2008. С. 23–32; В.Н. Сидорцов, *Опыт периодизации отечественной истории* [w:] *Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны*. Мінск, Вып. 7. С. 165–169.

[5] С.В. Паноў, *Школьная гістарычная адукацыя: этапы развіцця ў Рэспубліцы Беларусь* [w:] *Научные труды Республиканского института высшей школы*. 2018, Вып. 18, Ч. 3, С. 255–261; С.В. Паноў, *Агульнанацыянальная ідэя як канцэптуальная аснова для даследавання працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь* [w:] *Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе*. Пинск. 2018. Вып. 3. С. 371–375; С.В. Паноў, *Сучасны падручнік гісторыі Беларусі XIX стагоддзя як сацыякультурны феномен: дыдактычная канцэпцыя* [w:] *„Долгий XIX век" в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории*. Минск. 2017. Вып. 1. С. 110–117; С.В. Паноў, *Школьная гістарычная адукацыя Рэспублікі Беларусь: рэалізацыя еўрапейскіх канцэптаў* [w:] *Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава*. Гродна, 2021. С. 321–324.

[6] О.В. Колтан, *Наполнение символическим содержанием национальной идентичности учащейся молодежи при изучении истории Беларуси* [w:] *Научные труды Республиканского института высшей школы*. 2016. Вып. 16, Ч. 2. С. 357–362.

[7] А. Ластоўскі, *Вяртанне "доўгай генеалогіі" у школьныя падручнікі па гісторыі Беларусі* [w:] *Ідеологія і політика*, 2019, № 2 (13), С. 67–78.

[8] Р. Лінднэр, *Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / Пер. з ням. Л. Баршчэўскага; нав. рэд. Г. Сагановіча*. Выд. 2. СПб., Неўскі прасцяг, 2005.

Валянцін Грыцкевіч[9]. Грунвальдскую бітву як прыклад дзяржаўнай ідэалогіі і канструяванне нацыянальнага наратыва разгледзіў у сярэдзіне 2010-х гг. Генадзь Сагановіч [10]. Нарэшце ў 2018 г. пабачыла свет праца польскага даследчыка Войцэха Слешыньскага (Wojciech Śleszyński), дзе аўтар паспрабаваў вылучыць розныя "новыя" гістарычныя наратывы і гістарычныя міфы 1990–2010–х гг.[11].

Фарміраванне НГН – гэта дастаткова працяглы працэс, які ўключае: распрацоўку ўласнай храналогіі гістарычнага мінулага, складанне асноўных праблемна-тэматычных блокаў, вылучэнне нацыянальных Герояў і Перамог, Дасягненняў і Пакутаў народа, стварэнне і абгрунтаванне пэўных гістарычных міфаў, якія павінны тлумачыць месца нацыі ў сусветнай гісторыі, нарэшце, месц памяці нацыі і грамадства.

Стварэнне сучаснага беларускага НГН непарыўна звязана з тымі палітычнымі і грамадска-патрыятычнымі працэсамі, якія разгарнуліся ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гг. У першую чаргу на сітуацыю з трансфармацыяй беларускай інтэлектуальнай думкі паўплываў працэс нацыянальнага абуджэння другой паловы 1980-х гг., прастымуляваны агульнасавецкай палітыкай Галоснасці (як часткі дзяржаўнай палітыкі Перабудовы) і легалізацыяй беларускіх грамадскіх культурных ініцыятыў (ад студэнцкіх таварystваў і творчых аб'яднанняў да склікання культурніцкіх арганізацый і палітычных партый, арыентаваных на развіццё незалежнай беларускай дзяржавы).

Безумоўна, на прафесійную грамадскасць гісторыкаў у 1990-я гг. аказалі ўплыў наладжванне новых міждзяржаўных адносін (напрыклад, правядзенне польска-беларускіх і беларуска-літоўскіх канферэнцый гісторыкаў) і актывізацыя выдавецкай дзейнасці –

---

[9] В.П. Грыцкевіч, *Гісторыя і міфы*. Менск: «БелФранс», 1998.

[10] Г. Сагановіч, *Грунвальд у беларускай гісторыі. Спроба разбору палітычнага міфа***.** Мінск: Медысонт, 2015.

[11] W. Śleszyński, *Historia w służbie polityki. Zmiany polityczne a konstruowanie przekazu historycznego na ziemiach białoruskich w XX i XXI wieku*, Białystok, 2018.

публікацыя ці перадрук спадчыны беларускай гістарыяграфіі міжваеннага перыяду (выданне прац Мітрафана Доўнар-Запольскага[12], Усевалада Ігнатоўскага[13], Аляксандра Цвікевіча[14] ды інш.), папулярызацыя гістарыяграфічнай спадчыны беларускай паваеннай эміграцыі (Янкі Запрудніка[15], Паўла Урбана[16] і інш.) і, канешне, асобныя творы па папулярызацыі гістарычнага мінулага Беларусі (Міколы Ермаловіча[17], “100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі”, “Дзесяць вякоў беларускай гісторыі”, а таксама Кастуся Тарасава, Уладзіміра Арлова, Вітаўта Чаропка і інш.).

Спадчына Савецкай Беларусі ў спецыяльнай літаратуры па гісторыі Беларусі для сярэдняй школы – гэта падручнік “Гісторыя Беларускай ССР”, які выходзіў пад рэдакцыяй Л.С. Абэцэдарскага[18], і перажыў дзесяткі перавыданняў. У савецкія часы школьны падручнік разглядаўся ў якасці “нацыянальнага кампанента” ў агуль-

---

[12] М.В. Доўнар-Запольскі, *Асновы дзяржаўнасьці Беларусі*. Мінск, 1994. (першавыданні 1918–1919 гг.); М.В. Доўнар-Запольскі, *Гісторыя Беларусі*. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1994.

[13] У.М. Ігнатоўскі, *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд.* Мінск: Беларусь, 1991. (першавыданне 1921–1927 гг.); У.М. Ігнатоўскі, *Выбранае (Беларускі кнігазбор)*. Мінск: Беларуская навука, 2018.

[14] А. Цвікевіч, *„Западно-руссизм”: нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. 2-е выд*. Мінск: Навука і тэхніка, 1993.; А. Цвікевіч, *Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. Изд. 2-е, факсимильное*. Минск, 1990.; А. Цвікевіч, *Збор твораў у 2 т.* Т. 1.: Гістарычныя працы. Смаленск: Архе, 2021.

[15] Я. Запруднік, *Belarus: At a crossroads in history.* Westview Press, 1993.; Я. Запруднік, *Беларусь на гістарычных скрыжаваннях*. Мінск: Бацькаўшчына, 1996.; Я. Запруднік, *Палітычнае змаганне за Беларусь у царскіх Дзяржаўных думах (1906–1917 гг.)* [w:] *ARCHE*. 2009. № 1/2. С. 43–217.

[16] П. Урбан, *Да пытаньня этнічнай прыналежнасьці старажытных ліцвіноў*. Мінск: „Бацькаўшчына”, , 1994.

[17] М.І. Ермаловіч, *Па слядах аднаго міфа. Выд. 2-е, дапоўненае*. Мінск: Навука і тэхніка, 1991.; М.І. Ермаловіч, *Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд*. Мінск: „Бацькаўшчына”, 1994; М.І. Ермаловіч, *Старажытная Беларусь: полацкі і новагародскі перыяды*. Мінск: Мастацкая літаратура, 1990.

[18] *Гісторыя БССР: падручнік для сярэдніх школ / Л.С. Абецадарскі, М.П. Баранава, Н.Г. Паўлава*. Мінск: Народная асвета, 1960.

ным курсе гісторыі народаў СССР і быў запатрабаваны толькі “па волі” настаўніка. Пераважна экзэмпляры так і здаваліся ў канцы навучальнага года ў школьныя бібліятэкі з “неразрэзанымі” старонкамі. Універсітэцкае навучанне таксама было забяспечана шматтомнымі (ад аднаго-двух да пяці тамоў, дзе на XX ст. прыпадала да 4/5 аб’ёма матарыяла) выданнямі па гісторыі Беларускай ССР, створанымі аўтарскімі калектывамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, якія пачалі выдавацца пасля 1954 г.[19] Аднак як і выданні 1940-х гг.[20], дадзены прапісаны беларускі НГН не аказваў шырокага ўплыву на фарміраванне нацыянальнага самавызначэння студэнтаў.

Дэфармацыя савецкай палітычнай сістэмы і знікненне з палітычнай карты свету СССР распачалі зусім іншы працэс нацыянальнага самавызначэння беларусаў. Ён быў падмацаваны дэклараваннем Акта аб Незалежнасці, заменай савецкіх дзяржаўных сімвалаў і ўнёскам беларускіх гісторыкаў у фарміраванне новага НГН, роля якога была прынцыпова іншая чым савецкага – фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці ў грамадзян Рэспублікі Беларусь.

У 1991–1993 гг. распрацоўвалася Нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі, якая стала вынікам працы спецыяльнага аўтарскага калектыва, на чале з доктарам гістарычных навук М. Бічом і канферэнцый гісторыкаў Беларусі [21]. У яе падмурку знаходзіўся

[19] *История Белорусской ССР / Академия наук Белорусской ССР, Институт истории*. Минск: Издательство Академии наук Белорусской ССР, 1954; *Гісторыя Беларускай ССР / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут гісторыі*. Мінск: Выдавецтва Акадэміі навук Беларускай ССР, 1955–1958; *История Белорусской ССР: в 2 т. / Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. 2-е, дополненное изд*. Минск: Издательство Академии наук БССР, 1961.

[20] *Нарысы па гісторыі Беларусі*. Мінск, 1940; *История БССР / Академия наук Белорусской ССР, Институт истории*. Минск, 1946; *История БССР: макет / Академия наук Белорусской ССР, Институт истории*. Минск: Издательство Академии наук Белорусской ССР, 1948.

[21] В.А. Белозорович, *Формирование и развитие* […], S. 248, etc.

прынцып выкладання гісторыі Беларусі з "нацыянальных" пазіцый, а галоўны акцэнт рабіўся на фарміраванне і развіццё дзяржаўных фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ад Сярэднявечча да сучаснага часу.

Прадугледжваўся перагляд канцэпцыі па неабходнасці. І ў 2000-я гг. беларускі нацыянальны наратыў быў пераарыентаваны (але фактычна перадэклараваны) з нацыя-цэнтрычнага на цывілізацыйны: выкладанне гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай ці сусветнай цывілізацыі. Аднак афіцыйна "новая рэдакцыя" ніколі больш не была прынята. А яе роля перайшла да спецыяльных вучэбных праграм па гісторыі, якія ствараюцца спецыяльным навуковым калектывам (дэперсаніфікаваным) пры Нацыянальным інстытуце адукацыі і носяць рэкамендацыйны характар, змяшчаюць асноўныя базавыя кампаненты тэматычна-храналагічнага парадку. І могуць успрымацца аўтарамі падручнікаў дастаткова шырока.

З 1993–1994 гг. пачынаецца распрацоўка ў Рэспубліцы Беларусь адначасова падручнікаў як для сярэдняй, так і для вышэйшай школы. Гэта прывяло да таго, што да 2021 г. школьны (базавы) наратыў перажыў 5 пакаленняў падручнікаў, а ўніверсітэцкі – 2 (пры наяўнасці пастаўленага на паўзу ў 2019 г. і няўведзенага ў выкладанне прынамсі ў 2020/2021 навучальным годзе курса "Гісторыі беларускай дзяржаўнасці")[22].

[22] Відавочна спробы напісання пад маркай "метадалагічнага зябеспячэння" дзяржаўніцкага наратыва гісторыі беларускай дзяржавы рэалізоўваліся і раней: "Становление и развитие белорусской государственности" (Мінск: БДУ, 2011) і "История белорусской государственности: в 5 т." (Мінск: Беларуская навука, 2018–2020). Аднак яны не маглі задаволіць патрабаванні "трэцяга" пакалення ўніверсітэцкіх падручнікаў ні зместава, ні канцэптуальна. З'яўленне спецыяльна распрацаванага падручніка чакаецца пад 2022/2023 навучальны год. Абмеркаванне рукапісу распачалося на спецыяльных сходах пры ўніверсітэтах Беларусі ўвесну 2022 г. Мы не разглядалі падручнік па "Гісторыі беларускай дзяржаўнасці" 2022 г. (аўтарскі калектыў у складзе Каханоўскага А.Г., Марзалюка І.А., Цемушава С.М. і інш.) з прычыны адсутнасці фінальнай версіі на момант завяршэння артыкула.

Школьны наратыў застаўся функцыяніраваць у афіцыйна зацверджаных спецыяльнымі секцыямі і дзяржаўнымі камісіямі падручніках. Універсітэты маюць свае дапаможнікі (з 2010-х гг. таксама і электронныя) і арыентуюцца на тыпавую праграму для спецыяльнасцей вышэйшай школы, а не на комплекс базавых адзінак нацыянальнага гістарычнага наратыва, зацверджанага для папярэдняй ступені адукацыі[23]. Гэта часам прыводзіць да разбалансавання зместу выкладання нацыянальнай гісторыі ў сярэдняй і вышэйшай школе. Хаця ў аснове разумення дысцыпліны знаходзіцца сістэмнае выкладанне нацыянальнай гісторыі – ад засялення Беларусі старажытным чалавекам да палітычных, эканамічных і культурных працэсаў XXI ст.

Да чаго гэта прывяло? Фактычна да сегментацыі НГН Беларусі. Вылучэнню ў гістарычным мінулым істотных праблем, якія разглядаюцца адначасова і з пазіцый палітычнай гісторыі (гісторыя кіраўнікоў, гісторыя Перамог), і эканамічнага падмурку трансфармацый (наўрацці тут можна ўжо казаць пра свядомы фармацыйны падыход), і цывілізацыйнага падыходу, калі беларускія землі ў розныя эпохі адносяцца да культурнага памежжа між Усходам і Захадам (праўда без вызначэння геапалітычнай канатацыі, а толькі ў культурніцкім аспекце).

**Крыніцы**. У аснову нашага разгляду быў пакладзены аналіз базавых падручнікаў па гісторыі Беларусі для сярэдняй школы, выдадзеных на працягу 1994–2019 гг.: ад "бел-чырвона-белых" да "сіняй лінейкі". Пераважна аўтарскія калектывы захоўваліся на працягу некалькіх пакаленняў падручнікаў, асвятляючы той ці

---

[23] Цікава склаўся лёс праекта тыпавой праграмы па "Гісторыі Беларусі" замоўленай і створанай у канцы 2000-х гг. Праграма прапаноўвала варыятыўнасць у выкладанні базавага курса гісторыі Беларусі для непрофільных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў (храналагічны ці праблемны). Абмеркаванні ў калектывах гуманітарных кафедр прывялі да ігнаравання навацый і вымушанага вяртання да лінейнага выкладання гісторыі ва ўніверсітэтах, як у сярэдняй школе па форме, але не па зместу.

іншы перыяд гісторыі нягледзячы на змену прынцыпа выкладання гісторыі ў сярэдняй школе (лінейны прынцып ці прынцып канцэнтраў)[24] і ссоўванне перыядаў з аднаго года навучання на іншы. Аднак за амаль чвэрць стагоддзя існавання незалежнай сістэмы адукацыі беларуская дыдактыка і гістарычная навука ўсё ж панесла людскія страты (Георгій Штыхаў, Павел Лойка, Юры Бохан, Міхаіл Біч і інш.). Прыход на замену новых аўтараў прыносіў абнаўленне ў ідэйных падыходах да мінулага Беларусі, і пераважнае выхалашчванне зместу і, як вынік, інфарматыўнасці наратыва.

Вышэйшая школа, у плане тэкставага забеспячэння, у Беларусі адчувае сабе больш свабодна. Хаця ў 2000-х гг. былі рэалізаваны праекты па стварэнню падручніка па гісторыі Беларусі для непрофільных спецыяльнасцей[25], аднак у навучальным працэсе выкарыстоўваліся розныя курсы лекцый[26], акадэмічныя выданні[27] і нават персанальныя абагульняючыя працы беларускіх даследчыкаў[28].

**Перыядызацыя**. Вакол перыядызацыі гісторыі Беларусі разгарнулася стрыманая палеміка яшчэ ў 1990-я гг. За аснову школьнага курса гісторыі Беларусі (які быў сінхранізаваны з курсам Сусветнай гісторыі) быў прыняты крыху мадэрнізаваны цывілізацыйны

---

[24] А.А. Корзюк, *Сістэма гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе ў СССР і Рэспубліцы Беларусь (1934–2018 гг.)* [w:] *Беларускі гістарычны часопіс*. Мінск, 2018, №4, С. 45–49.

[25] Напрыклад: *Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў – па 2008 г.: вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / Я.К. Новік, І.Л. Качалаў, Н.Я. Новік*. Мінск: Вышэйшая школа, 2009.

[26] Напрыклад: *Гісторыя Беларусі: курс лекцый [для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў]: у 2 ч. / Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*. Мінск: РІВШ, 2000–2002.

[27] *Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / Акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі*. Мінск: Беларусь, 1994–1996; *Гісторыя Беларусі: у 6 т. / [рэдкалегія: М. Касцюк (галоўны рэдактар) і інш.]*. Мінск: Экаперспектива, 2002–2011.

[28] Г. Сагановіч, *Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст*. Мінск: Энцыклапедыкс, 2001.; З. Шыбека, *Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002)*. Мінск: Энцыклапедыкс, 2003.

падыход. У эпохах Старажытнасці, Сярэднявечча, Новага і Навейшага часоў, безумоўна, прасочвалася адаптацыя (магчыма – кампраміс) з раней ужыванымі перыядамі фармацыйнага падыходу: рабаўладальніцкім, феадальным, капіталістычным і г.д. Атрымалася своеасаблівае накладанне longue durée, "адшуканай" аўтарамі-метадыстамі ў канцы XX ст. школы Аналаў, на "дазволеную" палітычную гісторыю Беларусі. Старажытнасць расцягнулася на дадзяржаўны перыяд у гісторыі беларускіх зямель і эпоху слявянскага засялення, а ранні Новы час, які ахоплівае гісторыю Вялікага Княства Літоўскага эпохі Ягелонаў і Рэч Паспалітую да падзелаў і паўстання Т. Касцюшкі, успрымаецца як доўгае Сярэднявечча з яго карпаратыўнай культурай і феадальнымі войнамі. Унармаванне і сапраўдная сінхранізацыя агульнагістарычных працэсаў адносіцца да XX ст. і эпохі Навейшага часу, дакладнага ў сваіх межах і спрэчнага ў інтэрпрэтацыях.

Універсітэцкі "варыянт" перыядызацыі з другой паловы 1990-х гг. быў запазычаны з "дзяржаўніцкай" перыядызацыі гісторыі Беларусі, прапанаванай У.М. Ігнатоўскім яшчэ ў 1920-я гг.[29] Эпохі былі вылучаны ў адпаведнасці з дзяржаўнымі фарміраваннямі, у якія ў той ці іншы час уваходзілі беларускія землі: Полацкае і Тураўскае княствы, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, Расійская імперыя і, нарэшце, СССР. У адрозненні ад У.М. Ігнатоўскага, які не задаваўся пытаннямі пра федэратыўнае ўладкаванне і, адпаведна, становішча тых ці іншых беларускіх тэрыторый у складзе дзяржаўных утварэнняў Сярэднявечча і Новага часу, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук уключыў разважанні пра статус Беларусі ў дзяржавах X – XX ст. у дэкларатыўныя дакументы (напрыклад, разважанні пра "дзяржаўнасць" як патэнцыял і "дзяржаву" як яго рэалізацыю).

**Тэрміналогія**. Для беларускага нацыянальнага гістарычнага наратыва 1990–2010-х гг. уласціва адвольнае выкарыстанне гістарыч-

[29] У.М. Ігнатоўскі, *Кароткі нарыс* [...].

най тэрміналогіі. Прынцыповыя для медыявістаў тэрміны Кіеўская Русь і Старажытнаруская дзяржава, феадальная раздробленасць і ўдзельны перыяд, феадальныя ці грамадзянскія войны – выкарыстоўваюцца ў падручніках і метадычных матарыялах паралельна, а барацьба вакол іх вядзецца не ў публічным абмеркаванні, а ў кулуарах Нацыянальнага інстытута адукацыі і рэцэнзіях на выданні.

Часам беларускі НГН ідзе на відавочныя саступкі іншым нацыянальным наратывам. Так, у 1990-я гг. пачаў фарміравацца падыход да дзяржаўнага ўтварэння Вялікае Княства Літоўскае як шматэтнічнага і федэратыўнага фарміравання, адсюль свядома ўводзілася ў навучальны зварот "поўная" назва дзяржавы, якая павінна была падкрэсліць асноўныя складовыя часткі – Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае (Беларусь vs Літва). Аднак прынцыповасць першай паловы 1990-х гг. у адносна непрацяглым "змаганні" за першаснасць у спадчыне за Вялікае Княства змяняецца тэрміналагічнай ўніфікацыяй – выкарыстоўваецца проста "ВКЛ". Перыядычна для XIII ст. трапляе ў тэксты падручнікаў тэрмін Літоўская дзяржава, відавочна запазычаны асобнымі беларускімі аўтарамі з наратываў У. Пашуты і Э. Гудавічуса. Працэсы мінімізацыі назвы дзяржавы праходзіць таксама ўжываная назва Рэч Паспалітая Абодвух Народаў, якая ў 1990-я гг. павінна была падкрэсліваць састаўны кампанент дзяржаўнага ўтварэння, як Кароны і Княства (а Княства – пераважна беларускія землі і г.д.). Аднак у 2000–2010-я гг. становіцца неістотным у святле таго, што выкарыстанне назвы Рэч Паспалітая для перыяду ад 1569 да 1795 гг. сумяшчаецца ў нацыянальным наратыве з выкарыстаннем наймення "доўгае" Вялікае Княства Літоўскае, якое паралельна выкарыстоўваецца для вылучэння мясцовай палітыкі ці ілюстравання т.зв. "ліцвінскага сепаратызму" (тэзісы якога прасоўваліся ў беларускай гістарыяграфіі П.А. Лойкам)[30].

---

[30] П.А. Лойка, *Гісторыя Беларусі: 7 клас* […] С. 40, etc.; *Нарысы гісторыі Беларусі у 2 ч.* Ч. 1. С. 136, etc.

Складаней з перыядам XIX–XX ст., калі беларускі нацыянальны наратыў уступае ў супрацьстаўленне з расійскім ці нават савецкім, непераасэнсаваным у Беларусі, наратывам. Гэта праяўляецца ў розначытаннях беларускіх падручнікаў па сусветнай і айчыннай гісторыях адносна вайны 1812 г. (спрэчным з'яўляецца выкарыстанне тэрміна "айчынная вайна" да падзей чэрвеня–лістапада) і паўстанняў XIX ст. (размежаванне "польскіх дваранскіх рэвалюцыянераў, што дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі" і "ўласна беларусаў").

Нарэшце са з'яўленнем дадатковага спецыяльнага курса, прысвечанага падзеям 1939–1945 гг. з'яўляецца дылема ў назве падзей Другой сусветнай вайны. У выніку курс набыў досыць грувасткую канструкцыю "Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны"[31]. У некаторай ступені тэрміналагічна не была вызначана праблема пачатку вайны для Беларусі – верасень 1939 г. ці чэрвень 1941 г. Тым часам наступствы вайны для беларускага народа і тэрыторыі дзяржавы змяшаліся з савецкім кантэкстам (перамогі і паразы Чырвонай арміі), часта нетоесным беларускаму нацыянальнаму (матарыяльныя, людскія, культурныя страты; партызанская і падпольная барацьба, наяўнасць розных антыфашысцкіх фарміраванняў і г.д.).

*Сярэднявечча*. Эпоха складання дзяржаў ва Усходняй Еўропе ў IX – XII ст. вяртае ў наратыў "старажытнарускі" кампанент. Фактычна гаворка ідзе пра дзяржаўніцкі дыскурс (якія землі ў якія княствы ўваходзілі) пераважае над культурніцкім (quasi-візантыйская палітычная і рэлігійная культура).

Пры гэтым за 1990-я – 2010-я гг. паступова была згублена прысутнасць Смаленскага і Чарнігаўскага княстваў у НГН. Тытульныя

---

[31] *Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учебное пособие: для широкого круга читателей / А.А. Коваленя [и др.]*. Минск: БГУ, 2005; *Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): пособие для учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения / [А.А. Коваленя и др.]*. Минск: БГУ, 2020.

княствы нібыта абнулілі гісторыю беларускіх земель, якія тэрытарыяльна ўваходзілі ў гэтыя дзяржаўныя ўтварэнні. З 2000-х гг. асобна разглядаецца рэгіён Панямоння, з якога вылучаецца гісторыя Гарадзенскага княства і ўзнікненне Наваградскага княства. Перадгісторыя апошняга лагічна падводзіць да гісторыі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага ў 1240–1260-я гг. пад кіраўніцтвам Міндоўга і Войшалка. Пачатковая гісторыя Вялікага Княства шчыльна звязана з адным з самых устойлівых тэзісаў беларускай гістарыяграфіі 1990-х гг. – утварэннем дзяржавы ва ўмовах знешнепалітычнай пагрозы. Аднак дыскурс утварэння дзяржавы не тлумачыць сувязь з папярэдняй эпохай славянскай каланізацыі рэгіёна і сувяззю з Тураўскім і іншымі княствамі Усходняй Еўропы.

Перавага дзяржаўніцкага кампанента над тэрытарыяльным робіць частку рэгіянальнай гісторыі Сярэднявечнай Беларусі фактычна нябачнай для чытачоў падручнікаў. Безумоўна кампенсаваць лакуны такога падыходу магчыма за кошт стварэння хрыстаматый і кніг для чытання, а таксама выкарыстання картаграфічнага матарыялу. Аднак стварэнне падобнага прадукта адбываецца марудна і на манапалізаванай аснове, што часам прыводзіць да разначытання візуальнага матарыялу і тэксту падручнікаў.

Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага праз усе перавыданні і перапісванні падручнікаў захоўвае кампаненты беларускага паходжання. Гэта звязана з прыняццем тэзіса аб пачатковым ядры дзяржаўнасці Вялікага Княства ў Наваградскім княстве, горада Наваградка як месца хросту і каранацыі князя Міндоўга. Беларускія падручнікі падкрэсліваюць беларуска-літоўскі (адпаведна славянска-балцкі характар) дзяржавы. Кампанент сумеснай барацьбы супраць знешняй экспансіі з'яўляецца вырашальным для захавання шматэтнічнасці і полірэлігійнасці дзяржавы, і як вынік фарміравання талерантнага грамадства на беларускіх землях у дадзеную эпоху.

Палітычная гісторыя XIV – першай паловы XV ст. з'яўляецца галоўным эпізодам наратыва (праз гісторыю пашырэння дзяржавы

за кошт славянскіх і балцкіх зямель рэгіёна прамалёўваюцца вобразы вялікіх князёў Гедыміна, Альгерда і Вітаўта). Паступова ад падручнікаў сярэдзіны 1990-х гг. да выданняў 2010-х гг. адбываецца выхалашчванне інфармацыі пра эканамічныя адносіны і стан культуры беларускіх зямель XIII – XV ст. У кампаненце знакавых перамог застаецца дамінант барацьбы з Тэўтонскім ордэнам і як яе апагей – топас Грунвальдскай бітвы[32].

**Дынастыі і міждзяржаўныя ўніі**. Дынастычная гісторыя не склалася ў беларускай гістарыяграфіі ні ў XX ст., ні ў пачатку XXI ст. У сувязі з гэтым ні Ягелонам на вялікакняжацкім прыстоле, ні Вазам не было прысвечана комплекснае даследаванне. Відавочна гэта звязана з гістарыяграфічнай традыцыяй усходняй Еўропы, якая склалася ў XX ст. і да сённяшняга часу ўплывае на нацыянальны гістарычны наратыў[33].

З іншага боку ацэнка перыяду канца XIV–XVI ст. знаходзіцца пад моцным уплывам ацэнак заключаных уній паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім каралеўствам (у падручніках разглядаюцца Крэўская, Віленска-Радамская, Гарадзельская і потым Люблінская як комплекс інтэграцыйнага плану). Прыход вялікага князя Уладзіслава-Ягайлы на польскі каралеўскі трон і прыход каралевіча Казіміра Ягелончыка на вялікакняжацкі ўключаюцца ў адзіны комплекс злучэння двух дзяржаў. Персанальныя і дзяржаўныя ўніі маюць дастаткова размытую ацэнку эфектыўнасці – калі ў выпадку перамогі на ўсходнім фронце гэта дабро, дык у выпадку змены грамадска-палітычнага ўкладу Вялікага Княства гэта паланізацыя.

---

[32] Г. Сагановіч, *Грунвальд у беларускай гісторыі* […]; *Kto wygrał bitwę pod Grunwaldem: tradycja grunwaldzka wśród narodów Europy Środkowo-Wschodniej* / D. Mačiulis, R. Petrauskas, D. Staliūnas; z języka litewskiego tłumaczyła B. Piasecka. Warszawa: Instytut Pamięci Narodowej, 2020. – S. 113–119, 281–296.

[33] Любы, А.Ул. *Ягелоны і іх эпоха ў нацыянальнай гістарыяграфіі Беларусі і Літвы XX – пачатку XXI ст.: эвалюцыя праблематыкі* [w:] *Научные труды Республиканского института высшей школы*. Вып. 18. В 3 ч. Ч. 1. Мінск, 2018. С. 272–278.

Вялікае Княства эпохі Ягелонаў і Вазаў магло стаць адкрыццём для НГН канца XX – пачатку XXI ст. Фактар археаграфічных працэсаў (публікацыя і доступ да Метрыкі ВКЛ, які адкрываецца ў 1990-я гг. у гістарычных архівах Мінска і Вільні) і дысертабільнасць тэмаў па XVI ст. адкрываюць шырокія магчымасці для перагляду менавіта гэтага абсягу гісторыі беларускіх зямель. Сацыяльна-палітычныя і эканамічныя працэсы, развіццё сістэмы кіравання, заканадаўства, вайсковай справы – становіцца прадметам беларускай школы даследавання Вялікага Княства ў 1990–2000-я гг.[34]. Аднак персанальныя даследаванні XXI ст. амаль не знаходзяць адлюстравання ў НГН.

**Рэч Паспалітая**. Дыскурс Рэчы Паспалітай – гэта складанае пытанне для беларускай гістарыяграфіі, адказ на які не быў дадзены канчаткова ні ў адным выданні XXI ст.[35] У 1990-я гг. П.А. Лойка ў сваіх дыдактычных тэкстах па перыяду заключэння і рэалізацыі Люблінскай уніі 1569 г. у Вялікім Княстве Літоўскім уздымае пытанне "ліцвінскага сепаратызма" як формы барацьбы супраць абмежавання праў і свабод літвінскай дзяржавы. Хаця сам сюжэт не знайшоў шырокага водгуку ў спецыяльнай літаратуры, аднак "літвінскі сепаратызм" як з'ява застаўся ў нацыянальным гістарычным наратыве XXI ст. і перыядычна трансфармуецца ў зусім іншыю палітычную з'яву – вуступленне супраць уній з Польскім каралеўствам, супраць паланізацыі.

Эпоха Рэчы Паспалітай уяўляецца ў нацыянальным наратыве вельмі спрэчным перыядам "войнаў", "заняпадаў" і "культуры". Фактычна дзякуючы П.А. Лойку эпоха "Беларускага Адраджэння"

---

[34] *Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991–2003 гг.: матэрыялы міжнароднага круглага стала (16–18 мая 2003 г., г. Гродна) / [рэдкалегія: С.Б. Каўн (адказны рэдактар) і інш.].* Мінск: Медисонт, 2006. С. 112–168.

[35] *Гісторыя Беларусі: у 6 т. / [рэдкалегія: М. Касцюк (галоўны рэдактар) і інш.]. Т.3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII ст.).* Мінск: Экоперспектива, 2004; *История белорусской государственности: в 5 т. / Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. Т.1.* Минск: Беларуская навука, 2018.

расцягваецца (накладаецца) на эпохі Рэнесанса і Барока[36]. Яна ўключае ў сябе непадзельны працэс інтэнсіўнай і трывалай інтэграцыі ў заходнееўрапейскую культурную прастору (у адварот тэндэнцыям, паказаным у савецкім наратыве Л.С. Абэцэдарскага). Для культуры Беларусі XVI – XVII ст., а таксама і пачатку XVIII ст. вылучаюцца две дамінанты – кнігадрукаванне і адукацыя. Пры гэтым у праблему кніжнай культуры ўключаецца і яе зместавы (эпоха палемічнай літаратуры) і візуальны (кніжная гравюра) кантэнт. Адукацыйная дзейнасць Ордэна езуітаў становіцца ключавой у выяўленні адрозненняў гістарычнага шляху паміж прасторай Расійскай дзяржавы ды Цэнтральнай і Усходняй Еўропай Рэчы Паспалітай. Нават асноўная звязваючая асоба – герой "брацкасці беларускага і рускага народаў" Сімяон Полацкі падкрэслена выступае як выпускнік Віленскай езуіцкай вучэльні і чалавек, які зрабіў уклад у адукацыю расійскага манарха Пятра Аляксеевіча. Культура XVIII ст. цалкам аддадзена архітэктуры Беларускага (Віленскага) барока і яго трансфармацыі ў класіцызм.

Войны XVII ст. увайшлі ў нацыянальны гістарычны наратыў Беларусі яшчэ ў савецкім варыянце, але былі значна скарэктаваныя ў 1990-я гг. і фактычна кананізаваныя нават на тэрміналагічным узроўні ў 2000-я і 2010-я гг. У першую чаргу звернем увагу на вайну 1609–1618 гг. (замацаваны тэрмін "Інтэрвенцыя" змяніў свае канатацыі з "чужой" на "сваю") і 1654–1667 гг. (вайна атрымала персаніфікаванае выяўленне ў 1990-я як "вайна з Аляксеем Міхайлавічам", у 2000-я адзяржаўнілася "вайной Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы", каб потым нарэшце нейтралізавацца "Трынаццацігадовай" у варыянтах апошняга пакалення наратыва).

Беларускі НГН адкрыў для сябе і іншыя, акрамя расійскіх, войны – з туркамі і шведамі. Своеасаблівым прарывам стала ўнясенне ў спіс нацыянальных Перамог бітвы пад Кірхгольмам. Шведскі накірунак, як і даследаванне ВКЛаўскай Прыбалтыкі былі

[36] П.А. Лойка, *Гісторыя Беларусі: 7 клас* […] С. 89, etc.

актуалізаваны ў 2010-я гг. абаронай некалькіх дысертацый[37], аднак не знайшлі адлюстравання ў НГН. Турэцкія войны, якія ўласна не закранулі ні тэрыторыі, ні становішча Вялікага Княства былі прапісаныя ў сувязі з выбітнымі перамогамі Рэчы Паспалітай – Хоцімскай бітвай 1621 г. і бітвай пад Венай 1683 г. Гэта, відавочна, размыла разуменне аб дыстанцыраванні ВКЛаўскай часткі гісторыі Рэчы Паспалітай ад польскіх Перамог і польскага наратыва. Аднак пры ўсіх намаганнях адшукаць свой сюжэт і свае Перамогі – атрымалася, што агульная гісторыя Рэчы Паспалітай усё-ж інтэгравала беларускі наратыў з агульнарэгіянальным (польскім, украінскім, літоўскім).

Вышэйзгаданыя змены паўплывалі на інтэрпрэтацыю яшчэ адной вайны: казацка-сялянскай 1648–1651 гг. Савецкі наратыў падкрэсліваў імкненне ўсходнеславянскіх народаў (беларусаў і украінцаў) да ўз'яднання з рускім. У канцы XX – пачатку XXI ст. чакаліся відавочныя змены і сюжэтаў, і інтэрпрэтацый. Аднак за трыццаць год складання НГН Беларусі пераасэнсавання падзей ні казацкіх паўстанняў канца XVI – першай паловы XVII ст., ні самой вайны з загонамі Багдана Хмяльніцкага на тэрыторыі Вялікага Княства не адбылося[38]. Пры захаваным і агульнавыкарыстаным тэрміне "казацка-сялянская вайна" змест наратыва ў розных аўтараў дыяметральна супрацьлеглы. Асэнсаванне ролі Вялікага Княства

---

[37] О.И. Евстратьев, *Колониальная политика герцогства Курляндия и Семигалия в XVII–XVIII вв.: диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук: специальность 07.00.03 Всеобщая история.* Минск, 2017.; В.У. Якубаў, *Інфлянты ў знешняй і ўнутранай палітыцы ВКЛ у канцы XVI – пачатку XVII ст.: дысертацыя на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук: спецыяльнасць 07.00.02 Айчынная гісторыя*. Мінск, 2013.

[38] *Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 3*. С. 71, etc.; С.А. Чаропка, *Казацка-сялянская вайна ў Беларусі, 1648–1651 гг.: дысертацыя на суіскане вучонай ступені кандыдата гістарычных навук: 07.00.02*. Мінск, 2009; В.Н. Кадира, *Антифеодальная борьба белорусского и украинского народов во второй половине XVI – первой трети XVII в.: диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07.00.02*. Минск, 2008.

ў вайне Рэчы Паспалітай, роля Януша Радзівіла і вялікакняжацкага войска, вынікі вайны для беларускіх зямель Палесся і Падняпроўя – ўсё гэта паступова пераўтварае падзеі 1648–1651 гг. у прэлюдыю да вайны 1654–1667 гг., а не апагей напружанай сацыяльнай сітуацыі гарадскіх і казацкіх паўстанняў канца XVI – першай паловы XVII ст.

**XVIII стагоддзе** з'яўляецца ў выглядзе асобнага сюжэта беларускага НГН у 1990-я гг. У наступныя гады яно па-ранейшаму застаецца там нягледзячы на тое, што ніколі асобна так і не было вылучана як самастойны перыяд. Тут фігуруюць дзве персанальныя эпохі – Аўгуста II Моцнага і Станіслава Аўгуста Панятоўскага з адмоўнай канатацыяй палітычнага жыцця, якое засланяе ўсе іншыя сферы. З "Сасам" звязаныя разбурэнні Вялікай паўночнай вайны, а з Панятоўскім – ліквідацыя дзяржавы Рэчы Паспалітай у выніку стварэння канфедэрацый і трох падзелаў.

Праблемай перыяду з'яўляецца дысананс паміж апісаннем эканамічных працэсаў і палітычнымі пераўтварэннямі. Першыя маюць станоўчую ацэнку, а другія падводзяць нас да страты дзяржаўнага суверэнітэту. Праўда, аўтары падручнікаў заўсёды падкрэслівалі абмежаваны характар самастойнасці Вялікага Княства ў межах агульнай супольнай дзяржавы, а ў галіне культуры і рэлігіі казалі пра адкрытую мэтанакіраваную паланізацыю і каталіцызацыю. Разам з тым падзелы Рэчы Паспалітай пачынаючы з 1990-х гг. трывала маркіруюцца як скасаванне дзяржаўнасці Беларусі.

У гэты перыяд з'яўляюцца свае Героі, фарміраванне якіх нарэшце адпавядае схемам папярэдняга "савецкага" НГН Беларусі – Антоній Тызенгаўз і Гарадзенская эканомія, Іахім Храптовіч і праявы фізіякратызма ў маёнтку Шчорсы. Любыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні разглядаюцца як відавочная дыялектычная мадэль – з'яўленне мануфактур, вызваленне сялян, перанясенне дасягненняў агракультуры з Заходняй Еўропы на беларускую вёску і горад. На жаль, да сённяшняга часу не з'явіліся беларускія працы прысвечаныя рэфарматарам такім як Антоній Тызенгаўз, Міхаіл Радзівіл Рыбанька, Іахім Храптовіч і інш. Дасягненні міжваеннай школы

Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя па даследаванню XVIII ст. дасюль не актуалізаваныя ў сучаснай беларускай гістарычнай навуцы[39].

**“Доўгае” XIX ст**[40]. Патэнцыял вывучэння XIX ст. для беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі быў зразумелы яшчэ ў 1970–1980-я гг. На даследаванне эпохі ўплывалі “правільныя” працэсы абуджэння народных мас на чале з К. Каліноўскім, вывучэнне станаўлення беларусазнаўства, развіццё эканамічных адносін. Можна назваць імёны знакавых навукоўцаў як Генадзь Кісялёў, Генадзь Каханоўскі, Мікалай Улашчык і інш. Знікненне савецкай гістарычнай мадэлі толькі пашырыла сацыяльную тэматыку даследаванняў у канцы XX – пачатку XXI ст.

Аднак для НГН 1990-х гг. XIX ст. засталося часам трох паўстанняў: Т. Касцюшкі, 1930–1931 гг. (магчыма – І. Лелявеля) і К. Каліноўскага. Іменны прынцып аказаўся вельмі важным для самаідэнтыфікацыі паўстанняў як сваіх. Аднак дэперсаніфікацыя школьнага наратыва, якая з пачатку XXI ст. паступова працягваецца да сённяшняга часу, змяняе і назвы падзей, і іх ідэнтыфікаты (падзелы Рэчы Паспалітай, французская кампанія, польскі мяцеж г.д.). Падобныя

---

[39] Гістарычная школа Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя не атрымала сваёй пераацэнкі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіяй ні ў канцы XX, ні ў XXI ст. На фоне паступова развітых навуковых праектаў па вывучэнню міжваеннага Універсітэта, навуковых асяродкаў міжваеннай Вільні, публікацый рознага кшталту па дзейнасці і спадчыне віленскай прафесуры ў Польшчы і Літве, пры наяўнасці спецыялістаў па Заходняй Беларусі і гістарычных кадраў у сучасных Віленскіх асяродках – “маўчанне” беларускай гістарыяграфіі выглядае больш чым дзіўным пры тым першасным патэнцыяле, які заключаны ў працах 1920–1930-х гг. (напрыклад, працы гарадзенца С. Касцялкоўскага і яго вучняў).

[40] Толькі з 2017 г. у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы ў Мінску пачаў выходзіць першы спецыялізаваны часопіс па эпосе: “Долгий XIX век в истории Беларуси и Восточной Европы”. На старонках шасці нумароў былі прадстаўлены актуальныя беларускія даследчыкі і іх праблематыка. Вынікам стала выданне ў Санкт-Пецярбургу ў 2022 г. рускамоўнага выдання матарыялаў часопіса асобнай манаграфіяй. Аднак як і з эпохамі-папярэдніцамі высновы дадзеных даследаванняў маюць паралельная існаванне з НГН, змешчаным у падручніках.

культурныя коды паступова пераўтвараюць “сваю” гісторыю Беларусі ў лепшым выпадку ў “нейтральную”, але часцяком у “чужую”.

У 1990-я гады назіралася тэндэнцыя разглядаць XIX ст. як час сацыяльнай мабільнасці. У ланцужок упісваліся сялянскія рэформы (люстрацыя 1840-х, вызваленне ад прыгона 1860-х); паступовы разбор шляхты, які нараджаў новыя катэгорыі насельніцтва Беларусі; сацыяльна-палітычны рух ад філаматаў і ваенных таварыстваў да стварэння партый у пачатку XX ст., якія выклікалі рэвалюцыі 1905–1907 і 1917 гг. і нацыянальнае Адраджэнне канца XIX – пачатку XX ст. Аднак наратыў М. Біча паступова замяняецца структураваным наратывам Уладзіміра Сосны, Святланы Марозавай і Сяргея Панова. У XXI ст. акцэнт НГН на эканамічныя і культурныя змены фактычна прымушае разглядаць беларускую нацыю як пасіўнага ўдзельніка гістарычнага працэса.

**Нацыянальны рух і нацыянальныя дзяржавы**. Асэнсаванне ў канцы XX ст. навуковай спадчыны 1920-х гг., пераважна прац М.В. Доўнар-Запольскага, прывяло НГН Беларусі да асэнсавання пераемнасці паміж дзяржаўнымі ўтварэннямі Беларускай Народнай Рэспублікай (БНР) – Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай (ССРБ) – Літоўска-Беларускай (ЛітБелССР) – Беларускай ССР. Ключавой датай стала дата правядзення Усебеларускага з’езда снежня 1917 г. У якасці каталізатара выступіла дзейнасць партый і арганізацый пачатку XX ст.: Беларускай Сацыялістычнай Грамады, газеты і выдавецтва “Наша ніва”, нацыянальных аб’яднанняў і арганізацый, якія дзейнічалі вясной-летам 1917 г. Аднак паступова (з канца 1990-х) гэты наратыў пачаў губляцца. Актуалізаваліся антаганістычныя ролі БНР і БССР. У ацэнках нацыянальнага руху на першае месца пачала высоўвацца роля прабальшавіцкіх арганізацый. Тым часам нацыянальны кампанент застаецца ў захаванні беларускай дзяржавы і развіцці інстытутаў беларускай культуры (Інбелкульт, Універсітэт, прафесійныя творчыя саюзы і г.д.).

Відавочным прарывам постсавецкага беларускага наратыва з’явілася ўключэнне гісторыі Заходняй Беларусі 1920–1930-х гг.

у НГН. Практычна стандартны набор маркераў эпохі трансліруецца ад 1990-х гг.: беларускія эсэры, КПЗБ, палітыка польскіх улад (праўда яе сутнасць за 2000–2010-ыя гг. губляецца). Па-за разглядам аказалася адукацыйная і культурная дзейнасць (магчыма за выключэннем Таварыства беларускай школы)[41].

**"Кароткае / насычанае" XX ст**. Праблема XX ст. у нацыянальным гістарычным наратыве як перыяду існавання Беларусі ў складзе СССР патрабуе пераасэнсавання. У школьным наратыве відавочна закладаліся два розныя падыходы да асэнсавання савецкага мінулага. Першы быў прапанаваны ў 1990-я гг. У.Н. Сідарцовым, В.М. Фаміным і С.В. Пановым. Ён прадугледжваў паступовую інтэграцыю грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця ў "генсекаўскую" перыядызацыю агульнасавецкага наратыва[42], часткова з выдзяленнем асаблівасцей беларускіх працэсаў (людскія страты падчас рэпрэсій, вылучэнне выбітных асоб агульнасавецкага значэння, такіх як палітыкі, пісьменнікі, акцёры)[43]. Другі, "эйфарыйны" наратыў Якава Новіка[44], які быў створаны для інтэграванага падручніка 10–11 класа прапаноўваў "этапы развіцця сацыялізму" ў БССР у якасці унутранай храналогіі гісторыі Беларусі 1930–1980-х гг. У апошнім варыянце БССР разглядалася як прагрэсіўна развітая краіна на кожным новым этапе і з відавочным крахам "шчаслівага жыцця" ў пачатку 1990-х гг. Перавага надавалася дасягненням кожнага перыяду, якія наводзілі на думку аб неабгрунтаваным развале СССР. Аўтар даваў ацэнку падзеям 1991 года зыходзячы са змен у грамадска-палітычным жыцці краіны, якія адбыліся ў сярэдзіне 1990-х гг.

---

[41] У супрацьвагу XIX – пачатку XX ст. калі роля Вільні, як беларускай Меккі застаецца усеахопнай.

[42] "Сталінскі таталітарызм", "Хрушчоўская адліга", "Брэжнеўскі застой" і г.д.

[43] *Гісторыя Беларусі 1917–1996 гг.: для 9 класа / У.Н. Сідарцоў, В.М. Фамін, С.В. Паноў*. Мінск: Народная асвета, 1997.

[44] *Гісторыя Беларусі XIX – пачатак XXI ст.: для 11 класа / пад рэдакцыяй Я.К. Новіка*. Мінск: БДУ, 2009.

Праблема школьнага наратыва XX ст. заключалася ў тым, што ад пачатку 2000-х да сярэдзіны 2010-х гг. суіснавалі два варыянта наратыва: пры цыклічнай сістэме канцэнтраў адначасова (гісторыя Беларусі XIX ст. вывучалася ў 8 класе асобна, а потым ў 11 класе павінна была паўтарацца разам з XIX ст.).

Важным эпізодам НГН XX ст. становіцца тэма Вялікай Айчыннай вайны, якая са стварэннем спецыяльных курсаў паступова была вылучана ў асобны прадмет, а затым інтэгравана ў гісторыю Беларусі. Пры гэтым захоўвала магчымасць вывучэння яшчэ раз у факультатыўнай форме. Ідэя фарміравання гістарычнай памяці на прыкладзе Другой сусветнай вайны была відавочнай для Беларусі і да 1991 і пасля 1994 г. Стварэнне асобнага падручніка пад рэдакцыяй А.А. Кавалені прывяло да фарміравання беларускага наратыва Вайны. Гэта аднак не паўплывала на наратыў школьнага падручніка. Асноўныя моманты несутыкнення вынікаюць з акадэмічнасці першага наратыва і дыдактычнасці другога, зарыентаванага на суперажыванне гісторыі навучэнцамі і адпаведнасці з эўрыстычнымі падыходамі апошняга дзесяцігоддзя. У выніку мы маем паралельны падвоены наратыў, які і несупярэчыць адзін аднаму, але і не дапаўняе адзін другога. У педагагічным працэсе найбольшую ролю адыгрываюць школьныя канферэнцыі, мемарыялізацыя, месцы памяці і, канешне, спецыялізаваныя музеі, якія сёння фарміруюць наратыў вайны ў навучэнцаў.

**Неасэнсаваная і "незапатрабаваная" незалежніцкая эпоха**. Дадзены перыяд гісторыі ў навучальным працэсе можна ахарактэрызаваць наступным чынам: не вывучаецца і не выкладаецца. Апошняя вучэбная чвэрць, як і апошнія лекцыі ў агульных універсітэцкіх курсах па гісторыі Беларусі як правіла "схлопваюцца" інфарматыўна, а 1990-я – 2010-я гг. акурат павінны былі б змяшчацца ў апошніх раздзелах і тэмах. Магчыма таму наратыў "сучаснасці" прапісаны дастатакова схематычна (палітыка, эканоміка і культара маюць рознае па памерах і зместу насычэнне).

У падручніках сучасная эпоха практычна не падзяляецца на перыяды – яна "расце" ў часе. Канцэнтрацыя ўвагі даецца на трох момантах: афармленне незалежнасці пасля распаду СССР (прычыны і наступствы тут незаўсёды прасочваюцца, бо акцэнт робіцца на прыняцці тых ці іншых дзяржаўных актаў), эканамічным становішчы краіны і дасягненнях спорту і культуры.

Да 2020 г.[45] у НГН практычна не было адкуль браць абагульненую інфармацыю. Гісторыкі не любяць і рэдка карыстаюцца творамі сучаснасці пра сучаснасць, крыніцамі, якія ствараюцца ў актуальным часе і маюць неверыфікаваную аснову. Відавочна гэтая частка НГН з'яўляецца найбольш фармальнай і спрошчанай ("нядобрыя" дзевяностыя vs "нармальныя" нулявыя). У сувязі з гэтым "творчасць" аўтара падручніка ў асноўным праяўляецца ў ацэнках на спартыўных ды культурных дасягненнях Беларусі – тых маркерах, якія паказваюць месца дзяржавы ў рэгіёне і свеце, дазваляюць рэпрэзентаваць сучаснасць Беларусі[46].

**Персаніфікаваныя праекты ў НГН Беларусі**. Нельга казаць пра абязлічванне тых ці іншых частак НГН Беларусі ў 1990-ыя – 2010-я гг. Відавочна за тэкстамі і сюжэтамі стаяць асобы аўтараў. У некаторых тэзісах, якія былі ўведзены ў НГН Беларусі, праглядаецца навуковы бэкграўнд, а дзесці – абазнанасць у праблематыцы і гістарыяграфіі суседскіх НГН.

Перыяд дагісторыі, які ўключае археалагічныя эпохі камня, бронзы і жалеза, а таксама славянскага засялення Беларусі паўнавартасна разглядаліся бадай-што толькі ва ўніверсітэцкім наратыве і пераважна аўтарства М.М. Чарняўскага. У аснову быў пакладзены яго тэкст, які паступова мадэрнізаваўся ад 1990-х гг. і быў дапра-

---

[45] *История белорусской государственности: в 5 т. / Национальная академия наук Беларуси, Институт истории*. Минск: Беларуская навука, 2018–2020. Т. 5., прысвечаны перыяду кіравання А.Г. Лукашэнкі.

[46] Безумоўна, што падзеі пасля 24 лютага 2022 г. перакрэслілі і зрабілі неактуальнымі многія маркеры гонару, у тым ліку "спорт высокіх дасягненняў" як рэпрэзентант Беларусі ў свеце.

цаваны А.А Егарэйчанкам да ўніверсітэцкага выдання 2018 г.[47] Школьны наратыў абапіраецца на тэзісы М.М. Чарняўскага, аднак паступова праз XXI ст. "старажытная" складаючая НГН губляецца па прычыне скарачэння аб'ёмаў і ўзроставых магчымасцяў сярэдняй школы[48]. У выніку засталіся энцыклапедычныя веды.

Для перыяду IX–XIII ст. за тры дзесяцігоддзя змянілася тры галоўных аўтара школьнага наратыва: адным з першых быў Э.М. Загарульскі[49]. Уласная версія гісторыі Полацкай дзяржаўнасці была прапанавана з канца 1990-х гг. Георгіям Штыхавым, якога паступова ў пачатку 2010-х гг. змяніў Сцяпан Цемушаў.

Наступны цалкам складзены наратыў утварэння і станаўлення Вялікага Княства Літоўскага як шматнацыянальнай і полірэлігійнай дзяржавы з'явіўся ў НГН яшчэ ў 1990-я гг. Яго належыць лічыць кампрамісным да беларускай і літоўскай нацыянальных канцэпцый Міколы Ермаловіча і Эдварда Гудавічуса. У 1990-ыя гг. ён набыў уніфікацыю ў выглядзе канцэпцыі Аляксандра Краўцэвіча, якая застаецца актуальнай і для школьнага, і для універсітэцкага наратываў. Яе сутнасць гэта ідэя сумеснай барацьбы і суіснавання ў палітычнай прасторы Панямоння балцкага і славянскага этнасаў. Яна не з'яўляецца ні этнанацыянальным міфам у гістарыяграфіі, ні спробай пераасэнсавання іншых склалых канцэпцый. У дадзеным выпадку мы маем дачыненне з кампрамісным наратывам, які ў падручніках не акцэнтуе ўвагу на "малой вайне гісторыкаў" Беларусі і Літвы, якая ледзь не разгарэлася па праблеме ўтварэння Вялікага Княства

---

[47] *Гісторыя Беларусі ў 6 т. Т. 1: Старажытная Беларусь ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст*. Мінск: Экаперспектыва, 2000; *Гісторыя Беларусі ў 4 ч. / П.І. Брыгадзін і інш. Ч. 1: Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст*. Мінск: БДУ, 2018.

[48] Першапачаткова інфармацыйнымі кампанентамі былі "археалагічныя культуры" і "сацыяльная арганізацыя" людзей старажытнай Беларусі, у 2010-я гг. засталіся пераважна знакавыя знаходкі і стаянкі каменнага і іншых вякоў.

[49] *Гісторыя Беларусі: са старажытнейшых часоў да сярэдзіны I тысячагоддзя н. э.: падручнік для 5-га класа агульнаадукацыйнай школы / Э.М. Загарульскі*. Мінск: Народная асвета, 1998.

ў гістарыяграфіі 1990-х гг. і сёння фактычна тлее толькі абапал археалагічных даследаванняў балта-славянскага памежжа XIII ст.

Сярэднявечча XIV–XV ст. – гэта сам па сабе рамантызаваны час у НГН Беларусі. Аднак стварэння аўтарскіх наратываў па дадзеным перыядзе не адбылося ні ў 1990-я, ні ў 2000-я гг. па прычыне перэферыйнасці эпохі Гедымінавічаў для аўтараў-даследчыкаў. У 1990-я гг. пэўную спробу зрабілі П. Лойка і С. Тарасаў, якія канцэнтравалі ўвагу на панаванні Альгерда і яго сыноў, а ў 2010-я гг. Ю. Бохан – на Грунвальдскай бітве і дасягненнях вялікага князя Вітаўта. Аднак у асноўным наратыў XIV–XV ст. – гэта топас збірання зямель Вялікага Княства ў класічнай трыядзе М.К. Любаўскага паводле схемы: захоп, дамова, шлюб. Да сённяшгяга часу дадзеная канцэпцыя не было перагледжана ні ў беларускай гістарыяграфіі, ні ў НГН[50].

Для ранняга Новага часу (XVI–XVIII ст.) у Беларусі існуе наратыў Паўла Лойкі. Ён з'яўляецца дастаткова распрацаваным аўтарам на аснове ўласных даследаванняў сацыяльна-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай гісторыі двух сацыяльных груп, сялянства і шляхты[51]. Пры напісанні падручнікаў і дапаможнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы П.А. Лойка ўнёс свой уклад у гісторыю Беларусі і разгляд катэгорый магнатэрыі і шляхты як народа палітычнага, "трагедыю" Люблінскай уніі, "ліцвінскі сепаратызм", Беларускае Адраджэнне ад Скарыны да скону Віленскага барокка. Тэксты П.А. Лойкі занялі сваё месца ў НГН, а яго вучні ў 2010-я гг. развівалі праблематыку XVI–XVII ст.

---

[50] Нездарма перыяд Сярэднявечча запоўнены літаратурнымі алюзіямі. У якасці прыкладу можна прывесці кнігу выпускніка Гістарычнага факультэта БДУ, беларускага пісменніка Уладзіміра Арлова "Таямніцы Полацкай зямлі", якая амаль два дзесяцігоддзі знаходзіцца сярод рэкамендаванай літаратуры ў падручніках па гісторыі Беларусі адпаведнага перыяда.

[51] П.А. Лойка, *Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі: эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII ст*. Мінск: Навука і тэхніка, 1991; П.А. Лойка, *Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст*. Мінск: БДУ, 2002.

Беларускі наратыў XVII–XVIII ст. часткова змяніўся толькі ў 2010-я гг., калі з'яўляецца гарадзенскі падручнік для сярэдняй школы (І.П. Крэнь, В.А. Белазаровіч)[52]. У сярэдзіне 2010-х калектыў аўтараў Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Наста Скеп'ян, Васіль Варонін, Андрэй Мацук) прапаноўвае ўласны падручнік для 7 класа[53]. У апошнім выпадку аўтары вылучаюць кардынальнае пераасэнсаванне НГН Беларусі XVIII ст.[54]

Наратыў XIX ст. таксама змяніўся на працягу трох дзесяцігоддзяў. Прапанаваны погляд М.В. Біча паступова ў XXI ст. быў заменены наратывам прапанаваным калектывам аўтараў (У.А. Сосна, С.В. Марозава, С.В. Паноў). Элементы наратыва пакрысе змяняліся ў бок сацыяльна-эканамічнай гісторыі.

Тым часам наратыў XX ст. мае два выразных варыянта: першы з 1990-х гг., які належыць калектыву аўтараў (У.Н. Сідарцоў, В.М. Фамін, С.В. Паноў) і канца 2000-х гг. (Я.К. Новік). У апошняй версіі школьнага падручніка для 9 класа (2019 г.) фактычна перамог першы (зменены) варыянт[55]. Што тычыцца ўніверсітэцкага наратыва, то ён быў канчаткова аформлены ў версіі гісторыкаў БДУ, што знайшло сваё адлюстраванне ў лекцыях па гісторыі Беларусі (выйшлі ў 2000 г. пад рэдакцыяй П.І. Брыгадзіна)[56].

---

[52] *Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання / І.П. Крэнь, В.А. Белазаровіч*. Мінск: БДУ, 2006; *Гісторыя Беларусі: другая палова XVI – канец XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 8-га класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання / В.А. Белазаровіч, І.П. Крэнь, Н.М. Ганушчанка*. Мінск: БДУ, 2010.

[53] *Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.: для 7-га класа пад рэдакцыяй В.А. Вароніна і А.А. Скеп'ян: / А.А. Скеп'ян, В.А. Варонін, А.У. Мацук*. Мінск: БДУ, 2017.

[54] *История белорусского государства в 5 т. Т. 1.*

[55] *Гісторыя Беларусі 1917–пачатак XXI ст.: для 9 класа / С.В. Паноў, У.Н. Сідарцоў, В.М. Фамін*. Мінск: БДУ, 2019.

[56] *Гісторыя Беларусі: курс лекцый у 2 ч. Ч. 2./ пад рэд. П.І. Брыгадзіна*. Мінск: РІВШ, 2000.

У праектах падручнікаў падчас нерэалізаванага перахода на 12-гадовае навучанне ў 2000-я гг. і пры пераходзе на канцэнтры ў другой палове 2010-х гг. маглі з’явіцца альтэрнатыўныя наратывы. Асабліва гэта тычылася гісторыі IX–XVIII ст.

Агляд сітуацыі беларускага гістарычнага наратыву быў бы няпоўны без уліку дасягненняў замежных аўтараў. У апошнія гады з’явіліся візіі (абагульняючыя працы) аўтараў звонку Рэспублікі Беларусь, але знутры беларушчыны (Ю. Грыбоўскі, В. Швед, А. Маркава)[57], а таксама праца літоўскага даследчыка, дырэктара Інстытута Вялікага Княства Русціса Камунтавічуса, які ўпершыню напісаў гісторыю Беларусі для літоўскіх чытачоў[58]. Аўтары зрабілі спробу асэнсавання стану новай, як аказалася толькі кароткачасовай, перазагрузкі НГН Беларусі.

**Высновы**. Агульныя высновы наконт стану НГН Беларусі могуць быць несуцяшальнымі. Выкладзены ў падручніках НГН Беларусі ў 2010-я гг. арыентуецца на спрашчэнне: адбываецца дэперсаніфікацыя тэкстаў падручнікаў, прымітывізацыя і схематызм сацыяльных і нават эканамічных працэсаў, размываецца нацыянальны кампанент у гісторыі культуры. Безумоўна, сітуацыя можа змяніцца ва ўмовах вывучэння гісторыі Беларусі ў 10–11 класах на больш высокім тэарэтычным узроўне ва ўмовах прадметнай спецыялізацыі[59]. Для ўніверсітэцкіх курсаў змены ў выкладанні павінны адбыцца ў 2022/2023 навучальным годзе пасля апрабацыі курса “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”, які кардынальна зменіць падыходы да выкладання гістарычнага мінулага Беларусі і закцэнтуе

---

[57] *Historia Białorusi od czasów najdawniejszych do roku 1991 / Viachaslau Shved, Jerzy Grzybowski*. Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 2020; *Dějiny Běloruska / Marková, A., Sahanovič, H., Šybieka, Z.*, Praha: Nakladatelstvi lidové noviny, 2021.

[58] R. Kamuntavičius, *Gudijos istorija. Baltarusijos istorija*. Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos centras, 2021.

[59] Падручнікі для 10 і 11 клас былі выдадзены ў двух варыянтах – базавым і прасунутым, для класаў з профільным вывучэннем гісторыі (існуе толькі ў выглядзе электроннага дадатка).

ўвагу на дзяржаўніцкай гісторыі (формы дзяржаўнасці, сімвалы, інстытуты і г.д.).

**P.S. Замест заключэння**. Тэкст рыхтаваўся як прамежкавы аналіз беларускага нацыянальнага гістарычнага наратыва па стану на 2021 год: пасля наступстваў падзей у краіне ў 2020 годзе і перад абвяшчэннем уладамі “Года гістарычнай памяці”. Аднак, замарудзіўшы з напісаннем, аўтар трапіў у пастку неспадзяванай для Беларусі сітуацыі. Разам з пачаткам поўнамаштабнай вайны ва Украіне і эвалюцыяй гуманітарнага і гуманістычнага крызісу на фоне зменаў ва Усходняй Еўропе для беларускай гістарычнай навукі (якую за 30 год незалежнасці выціснулі на перыферыю канструявання гістарычнай памяці і дзяржаўнай ідэалогіі) надышоў час сур’ёзнага іспыту. Якая будучыня існуючага НГН Беларусі? Колькі будзе яшчэ існаваць па інэрцыі сёняшні варыянт НГН? Што можа пасунуць яго ў афіцыйна-дыдактычным і аматарска-папулярызатарскім сегментах? Гэтыя пытанні яшчэ чакаюць адказу. Напэўна не варта перапісваць і нявечыць тэксты аўтараў 1990-х гг., паколькі патрабуецца новы падыход, які будзе адлюстроўваць дасягненні гістарыяграфіі XXI ст., а таксама адпавядаць часу і нацыянальным патрэбам выжывання ў новым зменлівым свеце.

## Бібліяграфія


Belazarovich, V.A. *Etapy i pieryjady u razwicci ajczynnajhistaryjahrafii (20-ja hady XX – paczatak XXI st.)* [w:] *Problemy metodologii issledovaniy istorii Belarusi : Materialymezhdunarodnoy nauchnoy konferentsii (Minsk, 26–27 oktyabrya 2006 goda )*. Minsk, 2008. S. 225–228. [Белазаровіч В.А. *Этапы і перыяды ў развіцці айчыннай гістарыяграфіі (20-я гады XX – пачатак XXI ст.)* [w:] *Проблемы методологии исследований истории Беларуси : материалы Международной научной конференции (Минск, 26–27 октября 2006 года )*. Минск, 2008. С. 225–228].

Belazarovich, V.A. *Formirovaniye i razvitiye kontseptsii istorii Belarusi v otechestvennoy istoriografii (v otechestvennoy istoriografii (vtoraya polovina XIX – nachalo XXI veka)*. Grodno: GrGU, 2020. [Белазаровіч В.А. *Формирование и развитие концепции истории Беларуси в отечественной*

*историографии (вторая половина XIX – начало XXI века)*. Гродно: ГрГУ, 2020].

Belazarovich, V.A. *Histaryjahrafija Historyibiełarusi: dapamożnik*. Hrodna: Hrdu, 2006 (wyd 2-je, 2009). [Белазаровіч В.А. *Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: дапаможнік*. Гродна: ГрДУ, 2006 (выд 2-е, 2009)].

Cwikiewicz, A. *„Zapadno-russuzm": narysyz historyi hramadskaj mysłi na Biełarusi u XIX i paczatku XX w. 2-je wyd*. Minsk: Nawuka i technika, 1993. [Цвікевіч А. *„Западно-руссизм": нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. 2-е выд*. Мінск: Навука і тэхніка, 1993].

Cwikiewicz, A. *Kratkij oczerk Wozniknowienijabiełorusskoj Narodnoj Riespubliki. Izd. 2-je, faksimilnoje*. Minsk, 1990. [Цвікевіч А. *Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. Изд. 2-е, факсимильное*. Минск, 1990].

Cwikiewicz, A. *Zbor tworau u 2 t. T. 1: Histarycznyja pracy*. Smalensk: Archie, 2021. [Цвікевіч А. *Збор твораў у 2 т. Т. 1: Гістарычныя працы*. Смаленск: Архе, 2021].

Czaropka, S.A. *Kazacka-sialanskaja wajna u Biełarusi, 1648–1651 hh.: dysiertacyjana suiskannie wuczonaj stupieni kandydata histarycznych nawuk: 07.00.02*. Minsk, 2009. [Чаропка С.А. *Казацка-сялянская вайна ў Беларусі, 1648–1651 гг.: дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук: 07.00.02*. Мінск, 2009].

Dounar-Zapol'ski, M.W. *Asnowy Dziarżaunas'ci Biełarusi*. Minsk, 1994. [Доўнар-Запольскі М.В. *Асновы дзяржаўнасьці Беларусі*. Мінск, 1994].

Dounar-Zapol'ski, M.W. *Historyja Biełarusi*. Minsk:Biełaruskaja Encykłapiedyja, 1994. [Доўнар-Запольскі М.В. *Гісторыя Беларусі*. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1994].

*Historyja Biełarusi 1917–1996 hh.: dla 9 kłasa / U.N.Sidarcou, W.M. Famin, S.W. Panou*. Minsk: Narodnaja aswieta, 1997. [*Гісторыя Беларусі 1917–1996 гг.: для 9 класа / У.Н. Сідарцоў, В.М. Фамін, С.В. Паноў*. Мінск: Народная асвета, 1997].

*Historyja Biełarusi 1917–paczatak CHCHI st.: dla 9kłasa / S.W. Panou, U.N. Sidarcou, W.M. Famin*. Minsk: BDU, 2019. [*Гісторыя Беларусі 1917–пачатак XXI ст.: для 9 класа / С.В. Паноў, У.Н. Сідарцоў, В.М. Фамін*. Мінск: БДУ, 2019].

*Historyja Biełarusi sa starażytnych czasou da kanca XVIII st.: wuczebny dapamożnik dla 10-ha kłasa ustanou, jakija zabiaspieczwajuc' atrymannie ahul'naj siaredniaj adukacyi, z biełaruskaj i ruskaj mowami nawuczanniaz 11-hadowym terminam nawuczannia / I.P. Kren', W.A. Biełazarowicz*. Minsk: BDU, 2006. [*Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII*

*ст.: вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання / І.П.Крэнь, В.А.Белазаровіч*. Мінск: БДУ, 2006].

*Historyja Biełarusi u 4 cz. / P.I. Bryhadzin iinsz. Cz. 1: Ad starażytnasci da siaredziny XVI st.* Minsk: BDU, 2018. [*Гісторыя Беларусі ў 4 ч. / П. І. Брыгадзін і інш. Ч. 1: Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст.* Мінск: БДУ, 2018].

*Historyja Biełarusi XIX – paczatak XXI st.: dla 11kłasa / pad redakcyjaj Ja.K. Nowika*. Minsk: BDU, 2009. [*Гісторыя Беларусі XIX – пачатак XXI ст.: для 11 класа / пад рэдакцыяй Я.К. Новіка*. Мінск: БДУ, 2009].

*Historyja Biełarusi, XVI—XVIII stst.: dla 7-ha kłasa padredakcyjaj W.A. Waronina i A. A. Skiepjan / A.A. Skiepjan, W. A. Waronin, A.U. Macuk*. Minsk : BDU, 2017. [*Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.: для 7-га класа пад рэдакцыяй В. А. Вароніна і А. А. Скеп'ян / А. А. Скеп'ян, В. А. Варонін, А.У. Мацук*. Мінск : БДУ, 2017].

*Historyja Biełarusi: ad starażytnych czasou – pa 2008 h.: wuczebny dapamożnik dla studentau ustanou, jakija zabiaspieczwajuc' atrymannie wyszejszaj adukacyi / Ja.K. Nowik, I. Ł. Kaczałau, N. Ja. Nowik*. Minsk: Wyszejszaja szkoła, 2009. [*Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў – па 2008 г.: вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / Я.К. Новік, І.Л. Качалаў, Н.Я. Новік*. Мінск: Вышэйшая школа, 2009].

*Historyja Biełarusi: druhaja pałowa XVI — kaniec XVIII st.: wuczebny dapamożnik dla 8-ha kłasa ahul'naadukacyjnychustanou z biełaruskaj mowaj nawuczannia / W.A. Biełazarowicz, I.P. Kren', N.M. Hanuszczanka*. Minsk: BDU, 2010. [*Гісторыя Беларусі: другая палова XVI – канец XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 8-га класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання / В.А. Белазаровіч, І.П. Крэнь, Н.М. Ганушчанка*. Мінск: БДУ, 2010].

*Historyja Biełarusi: kurs lekcyj [dla studentauwyszejszych nawuczal'nych ustanou] : u 2 cz. / Hrodzienski dziarżauny uniwiersitet im. Ja. Kupały, Biełaruski dziarżauny uniwiersitet*. Minsk: Respubłikanski instytut wyszejszaj szkoły, 2000–2002. [*Гісторыя Беларусі: курс лекцый [для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў]: у 2 ч. / Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*. Мінск: Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2000–2002].

*Historyja Biełarusi: sa starażytniejszych czasou dasiaredziny I tysiaczahod-dzia n. e.: padrucznik dla 5-ha kłasa ahul'naadukacyjnajszkoły / E.M.*

*Zaharul'ski*. Minsk: Narodnaja aswieta, 1998. [*Гісторыя Беларусі: са старажытнейшых часоў да сярэдзіны I тысячагоддзя н. э.: падручнік для 5-га класа агульнаадукацыйнай школы / Э.М. Загарульскі*. Мінск: Народная асвета, 1998].

*Historyja Biełarusi: u 6 t. / [redkalehija: M. Kasciuk (hałouny redaktar) i insz.]*. Minsk: Ekopierspiektiwa, 2007–2011. [*Гісторыя Беларусі: у 6 т. / [рэдкалегія: М. Касцюк (галоўны рэдактар) і інш.]*. Мінск: Экоперспектива, 2007–2011].

*Historyja Biełaruskaj SSR / Akademija Nawukbiełaruskaj SSR, Instytut historyi*. Minsk: Wydawiectwa Akademii nawuk Biełaruskaj SSR, 1955–1958. [*Гісторыя Беларускай ССР / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут гісторыі*. Мінск: Выдавецтва Акадэміі навук Беларускай ССР, 1955–1958].

*Historyja BSSR: padrucznik dla siarednich szkoł / Ł.S. Abiecadarski, M.P. Baranawa, N.H. Pauława*. Minsk: Narodnaja aswieta, 1960. [*Гісторыя БССР: падручнік для сярэдніх школ / Л.С. Абецадарскі, М.П. Баранава, Н.Г. Паўлава*. Мінск: Народная асвета, 1960].

Hryckiewicz, W.P. *Historyja i mify*. Miensk: «BiełFrans», 1998. [Грыцкевіч В.П. *Гісторыя і міфы*. Менск: «БелФранс», 1998].

*Istorija biełorusskoj gosudarstwiennosti: w 5 t*. Minsk: Biełaruskaja nawuka, 2018–2020. [*История белорусской государственности: в 5 т*. Мінск: Беларуская навука, 2018–2020].

*Istorija Biełorusskoj SSR / Akadiemija nauk Biełorusskoj SSR, Institut istorii*. Minsk: Izdatielstwo Akadiemii nauk Biełorusskoj SSR, 1954. [*История Белорусской ССР / Академия наук Белорусской ССР, Институт истории*. Минск: Издательство Академии наук Белорусской ССР, 1954].

*Istorija Biełorusskoj SSR: w 2 t. /Akadiemija nauk Biełorusskoj SSR, Institut istorii. 2-je, dopołniennoje izd*. Minsk: Izdatielstwo Akadiemii nauk BSSR, 1961. [*История Белорусской ССР: в 2 т. / Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. 2-е, дополненное изд*. Минск: Издательство Академии наук БССР, 1961].

*Istorija BSSR: makiet / Akadiemija nauk Biełorusskoj SSR, Institut istorii*. Minsk:Izdatielstwo Akadiemii nauk Biełorusskoj SSR, 1948. [*История БССР: макет / Академия наук Белорусской ССР, Институт истории*. Минск: Издательство Академии наук Белорусской ССР, 1948].

Yakubau, W.U. *Inflanty u znieszniaj i unutranaj pałitycy WKŁ u kancy XVI – paczatku XVII st.: dysiertacyja na saiskannie wuczonaj stupieni kandydata histarycznych nawuk: spiecyjal'nasc'07.00.02 Ajczynnaja historyja*. Minsk, 2013. [Якубаў В.У. *Інфлянты ў знешняй і ўнутранай палітыцы ВКЛ у канцы XVI – пачатку XVII ст.: дысертацыя на саісканне вучонай сту-*

*пені кандыдата гістарычных навук: спецыяльнасць 07.00.02 Айчынная гісторыя*. Мінск, 2013].

Jermałowicz, M.I. *Starażytnaja Biełarus'. Wilenski pieryjad.* Minsk: Bac'kauszczyna, 1994. [Ермаловіч М.I. *Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд*. Мінск: Бацькаўшчына, 1994].

Jermałowicz, M.I. *Starażytnaja Biełarus': połacki i nowaharodski pieryjady.* Minsk: Mastackaja łitaratura, 1990. [Ермаловіч М.I. *Старажытная Беларусь: полацкі і навагародскі перыяды*. Мінск: Мастацкая літаратура, 1990].

Kadira, W.N. *Antifieodalnaja bor'ba biełorusskogo i ukrainskogo narodow wowtoroj połowinie XVI – pierwoj trieti XVII w.: dissiertacyja na soiskanije uczenoj stiepienikandidata istoriczeskich nauk: 07.00.02.* Minsk, 2008. [Кадира В.Н. *Антифеодальная борьба белорусского и украинского народов во второй половине XVI – первой трети XVII в.: диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07.00.02*. Минск, 2008].

Kołtan, O.W. *Napołnienije simwoliczeskim sodierżanijemnacyonalnoj idienticznosti uczaszczejsia mołodieży pri izuczenii istorii Biełarusi* [w:] *Naucznyje trudy Riespublikanskogoinstituta wysszej szkoły*. 2016. Wyp. 16, Cz. 2., S. 357–362. [Колтан О.В. *Наполнение символическим содержанием национальной идентичности учащейся молодежи при изучении истории Беларуси* [w:] *Научные труды Республиканского института высшей школы*. 2016. Вып. 16, Ч. 2. С. 357–362].

Korziuk, A.A. *Sistema gistarycznaj adukacyi ўsiaredniaj szkole ў SSSR i Respubłicy Biełarus' (1934 – 2018)* [w:] *Biełaruski gistaryczny czasopis*. Minsk. 2018, №4, S. 45–49 [Корзюк, А.А. *Сістэма гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе ў СССР і Рэспубліцы Беларусь (1934 – 2018 гг.)* [w:] *Беларускі гістарычны часопіс*. Мінск. 2018, №4, С. 45–49].

Liuby, A.Ul. *Jagiellony i ich epocha u nacyjanal'naj Histaryjahrafiibiełarusi i Łitwy XX – paczatku XXI st.: ewalucyja prablematyki* [w:] *Naucznyje trudy Riespubłukanskohounstututa wyssziej szkoły*. Wypusk18. W 3 cz. Cz. 1. Minsk, 2018. S. 272–278. [Любы, А.Ул. *Ягелоны і іх эпоха ў нацыянальнай гістарыяграфіі Беларусі і Літвы XX – пачатку XXI ст.: эвалюцыя праблематыкі* [w:] *Научные труды Республиканского института высшей школы*. Выпуск 18. В 3 ч. Ч. 1. Мінск, 2018. С. 272–278].

Łastouski, A. *Wiartannie "doўgaj gieniealogii" uszkolnyja padruczniki pa gistoryi Biełarusi* [w:] *Idieołogiia i połitika*, 2019, № 2(13), S. 67–78. [Ластоўскі А. *Вяртанне "доўгай генеалогіі" у школьныя падручнікі па гісторыі Беларусі* [w:] *Ідеологія і політика*, 2019, № 2(13), С. 67–78].

Łindner, R. *Historyki i uɫada: nacyjatworczy pracesi histarycznaja pałityka u Biełarusi XIX–XX st./Pier. z niam. Ł. Barszczeuskaha; naw. red. H. Sahanowicza*. SPb., Nieuski prasciah, 2005. [Лінднэр Р. *Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст./Пер. з ням. Л. Баршчэўскага; нав. рэд. Г. Сагановіча*. СПб., Неўскі прасцяг, 2005].

Łojka, P.A. *Prywatnaułasnickija sialanie Biełarusi: ewalucyjafieadal'naj renty u druhoj pałowie XVI–XVIII st.* Minsk: Nawuka i technika, 1991. [Лойка П.А. *Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі: эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII ст*. Мінск: Навука і тэхніка, 1991].

Łojka, P.A. *Szlachta biełaruskich ziamiel' u hramadska-pałitycznym życci Reczy Paspałitaj druhoj pałowy XVI – pierszaj treci XVII st*. Minsk: BDU, 2002. [Лойка П.А. *Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст*. Мінск: БДУ, 2002].

*Narysy historyi Biełarusi: u 2 cz*. Minsk: Biełarus', 1994–1996. [*Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч.* Мінск: Беларусь, 1994–1996].

*Narysy pa historyi Biełarusi*. Minsk, 1940. [*Нарысы па гісторыі Беларусі*. Мінск, 1940].

Panou, S.W. *Ahul'nanacyjanal'naja ideja jak kanceptual'naja asnowa dla dasledawannia pracesu razwiccia szkol'naj histarycznaj adukacyi u Respubłicy Biełarus'* [w:] *Hosudarstwa Cientral'noj i Wostocznoj Ewropy w istoriczieskoj pierspiektiwie*. Pinsk. 2018. Wyp. 3. S.371–375. [Паноў С.В. *Агульнанацыянальная ідэя як канцэптуальная аснова для даследавання працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь* [w:] *Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе*. Пинск. 2018. Вып. 3. С. 371–375].

Panou, S.W. *Suczasny padrucznik historyi Biełarusi XIX stahoddzia jak sacyjakul'turny fienomien: dydaktycznaja kancepcyja* [w:] *„Dołgij XIX wiek" w istorii Biełarusi i Wostocznoj Ewropy: issledowanija po Nowoj i Nowiejszej istorii*. Minsk. 2017. Wyp. 1. S.110–117. [Паноў С.В. *Сучасны падручнік гісторыі Беларусі XIX стагоддзя як сацыякультурны феномен: дыдактычная канцэпцыя* [w:] *„Долгий XIX век" в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории*. Минск. 2017. Вып. 1. С. 110–117].

Panou, S.W. *Szkol'naja histarycznaja adukacyja: etapy razwiccia u Respubłicy Biełarus'* [w:] *Naucznyje trudy Riespublikanskogo instituta wysszej szkoły*. 2018. Wyp. 18, Cz. 3. S. 255–261. [Паноў С.В. *Школьная гістарычная адукацыя: этапы развіцця ў Рэспубліцы Беларусь* [w:] *Научные труды*

*Республиканского института высшей школы*. 2018. Вып. 18, Ч. 3. С. 255–261].

Panou, S.W. *Szkol'naja histarycznaja Adukacyjarespubłiki Biełarus': realizacyja jeurapiejskich kanceptau* [w:] *Biełarus' u kantekscie jeurapiejskaj historyi: asoba, hramadstwa, dziarżawa*. Hrodna, 2021. S. 321–324. [Паноў С.В. *Школьная гістарычная адукацыя Рэспублікі Беларусь: рэалізацыя еўрапейскіх канцэптаў* [w:] *Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава*. Гродна, 2021. С. 321–324].

Sahanowicz, H.M. *Kanstrujawannie aficyjnaha wykładu historyi u paslawajennaj BSSR* [w:] *Hadawik Centra Biełaruskich Studyjau*. 2015. Hod 1, № 1. S. 201–218. [Сагановіч Г.М. *Канструяванне афіцыйнага выкладу гісторыі ў пасляваеннай БССР* [w:] *Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў*. 2015. Год 1, № 1. С. 201–218].

Sahanowicz, H. *Białoruska historiografia wczoraj i dziś* [w:] *Przegląd Wschodni*, Warszawa, 2003. S. 759–775.

Sahanowicz, H. *Hrunwal'd u biełaruskajhistoryi. Sproba razboru pałitycznaha mifa*. Minsk: Miedysont, 2015 [Сагановіч, Г. *Грунвальд у беларускай гісторыі. Спроба разбору палітычнага міфа*. Мінск: Медысонт, 2015].

Sahanowicz, H. *Narys historyi Biełarusi ad starażytnasci da kanca XVIII st.* Minsk: Encykłapiedyks, 2001 [Сагановіч, Г. *Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.* Мінск: Энцыклапедыкс, 2001].

Sahanowicz, H. *Nationaler Aufbruch und politische Reaktion: zehn Jahre Historiographie in Belarus'* [w:] *Österreichische Osthefte.* Wien: Lang, 2002, Jg. 44, H. 1/2. P. 137–149.

Sidorcow, W.N. *Istorija kak politika* [w:] *Biełaruskaja dumka*. 2014. № 4. S. 61–64. [Сидорцов В.Н. *История как политика* [w:] *Беларуская думка*. 2014. № 4. С. 61–64].

Sidorcow, W.N. *Magistralnoje naprawlenije wrazwitii biełorusskoj istoriografii* [w:] *Obrazy proszłogo w istoriografii: biełorussko-francuzskij diałog: matieriały k mieżdunarodnoj nauczno- prakticzeskoj konfieriencyi „Istoriografija kakobjekt issledowanija", 21—22 maja 2008 g*. Minsk, 2008. S. 23–32. [Сидорцов В.Н. *Магистральное направление в развитии белорусской историографии* [w:] *Образы прошлого в историографии: белорусско-французский диалог: материалы к международной научно-практической конференции „Историография как объект исследования", 21–22 мая 2008 г.* Минск, 2008. С. 23–32.

Sidorcow, W.N. *Opyt pieriodizacyi otieczestwiennoj istorii* [w:] *Krynicaznaustwa i spiecyjal'nyja histarycznyja dyscypłiny*. Minsk, Wyp. 7. S. 165–169. [Сидорцов В.Н. *Опыт периодизации отечественной истории* [w:]

*Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны*. Мінск, Вып. 7. С. 165–169].

Sidorcow, W.N. *Problema optimizacyi socyalno-gumanitarnogo (istoriczeskogo) obrazowanijaw „niegumanitarnych" wuzach Biełarusi* [w:] *Wiesnik BDU*. 2013. № 1. S. 35–38 [Сидорцов В.Н. *Проблема оптимизации социально-гуманитарного (исторического) образования в „негуманитарных" вузах Беларуси* [w:] *Веснік БДУ*. 2013. № 1. С. 35–38].

Szybieka, Z. *Narys historyi Biełarusi (1795–2002)*. Minsk: Encykłapiedyks, 2003 [Шыбека, З. *Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002)*. Мінск: Энцыклапедыкс, 2003].

Śleszyński, W. *Historia w służbie polityki. Zmiany polityczne a konstruowanie przekazu historycznego na ziemiach białoruskich w XX i XXI wieku*, Białystok, 2018.

Urban, P. *Da pytan'nia etnicznaj prynależnas'ci starażytnych łicwinou*. Minsk: Bac'kauszczyna,1994. [Урбан П. *Да пытаньня этнічнай прыналежнасьці старажытных ліцвіноў*. Мінск: Бацькаўшчына, 1994].

*Velikaya Otechestvennayavoyna sovet·skogo naroda (v kontekste Vtoroy mirovoy voyny): uchebnoye posobiye: dlya shirokogo krugachitateley / A.A. Kovalenya [i dr.]*. Minsk: BGU, 2005. [*Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учебное пособие: для широкого круга читателей / А.А. Коваленя [и др.]*. Минск: БГУ, 2005].

*Velikaya Otechestvennayavoyna sovet·skogo naroda (v kontekste Vtoroy mirovoy voyny): posobiye dlya uchrezhdeniy obshchego srednego obrazovaniya s belorusskim irusskim yazykami obucheniya / [A.A. Kovalenya i dr.]*. Minsk: BGU, 2020. [*Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): пособие для учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения / [А.А. Коваленя и др.]*. Минск: БГУ, 2020].

*Wiałikaje kniastwa Łitouskaje: historyja wywuczennia u 1991–2003 hh.: materyjały miżnarodnaha kruhłaha stała (16–18 maja 2003 h., h. Hrodna) / [redkalehija: S.B. Kaun (adkazny redaktar) i insz.]*. Minsk: Miedisont 2006. S. 112–168. [*Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991–2003 гг.: матэрыялы міжнароднага круглага стала (16-18 мая 2003 г., г. Гродна) / [рэдкалегія: С.Б. Каўн (адказны рэдактар) і інш.]*. Мінск: Медисонт, 2006. С. 112–168].

Yeustratiyeu, O.I. *Kołonial'naja połitika hiercohstwa Kurlandija i Siemihałija w XVII—XVIII ww.: dissiertacyja na soiskanijeuczenoj stiepieni kandidata istoriczeskich nauk: spiecyalnost' 07.00.03 Wsieobszczaja istorija*. Minsk, 2017. [Евстратьев О.И. *Колониальная политика герцогства Курляндия*

*и Семигалия в XVII—XVIII вв.: диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук: специальность 07.00.03 Всеобщая история*. Минск, 2017].

Zaprudnik, J. *Biełarus' na histarycznych skryżawanniach*. Minsk: Bac′kauszczyna, 1996. [Запруднік Я. *Беларусь на гістарычных скрыжаваннях*. Мінск: Бацькаўшчына, 1996].

Zaprudnik, J. *Pałitycznaje zmahannie za Biełarus' ucarskich Dziarżaunych dumach (1906-1917 hh.)* [w:] *ARCHE*. 2009. № 1/2. P. 43–217. [Запруднік Я. *Палітычнае змаганне за Беларусь у царскіх Дзяржаўных думах (1906-1917 гг.)* [w:] *ARCHE*. 2009. № 1/2. C. 43–217].

Zaprudnik, J. *Belarus: At a crossroads in history.* Columbia Univ.The Harriman Inst. - Boulder etc.: Westview Press, 1993.

Ignatoŷski, U.M. *Wybranaje (Biełaruski knigazbor)*. Minsk: Biełaruskaja nawuka, 2018. [Ігнатоўскі У.М. *Выбранае (Беларускі кнігазбор)*. Мінск: Беларуская навука, 2018].

Ignatoŷski, U.M. *Karotki narys gistoryi Biełarusi.5-je wyd*. Minsk: Biełarus′, 1992. [Ігнатоўскі, У.М. *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд*. Мінск: Беларусь, 1992].

## Shaping and evolution of the national historical narrative as reflected in textbooks on the history of Belarus in 1991–2020

The article analyzes the content of textbooks on the history of Belarus in terms of shaping the national historical narrative in the years 1991–2020. The author presents the differences in the perception of the past that occur in textbooks used in secondary and higher education. It presents the most important historical issues that were interpreted differently under the influence of the changing historical policy of Belarus. The author also analyzes the conditions for shaping the national historical narrative. In addition, the author shows the contribution of individual scientists to the creation of a national historical narrative in the 21st century. In particular, this applies, inter alia, to Mikhail Bitch, Pavel Loyka, Yury Bokhan, Mikhas' Tcharniauski.

Keywords: historiography, history of Belarus, national historical narrative, textbooks